# Выкарыстанне прыёму “кроссэнс”

Адным са сродкаў паляпшэння эфектыўнасці вучэбнай і выхаваўчай дзейнасці школьнікаў у сучасных умовах лічыцца візуалізацыя вучэбнай інфармацыі.

Пад візуалізацыяй разумеецца любы спосаб забеспячэння назірання рэальнасці, а пад вынікам візуалізацыі або візуальнай мадэллю – любую канструкцыю, якая ўспрымаецца зрокава і імітуе сутнасць аб’екта пазнання.
Візуалізацыя выступае як прамежкавае звяно паміж вучэбным матэрыялам і вынікам навучання, забяспечвае сінтэз ведаў, дазваляе апасродкавана і наглядна прадставіць з’явы, якія вывучаюцца. Такім чынам, прадстаўленне вучэбнага матэрыялу ў структураваным выглядзе дазваляе хутчэй і больш якасна засвойваць новыя сістэмы паняццяў, спосабы дзеянняў. Напэўна, гэта заканамерна, улічваючы прыярытэтнасць кліпавай культуры ў век глабальнай інфарматызацыі.

Пад актыўнымі сродкамі візуалізацыі неабходна разумець не проста нагляднны ілюстрацыйны матэрыял, а сістэму перадачы візуальнай інфармацыі, якая дазваляе любому суб’екту ўзаемадзеяння здзяйсняць кіраванне інфармацыяй.

Візуалізацыя:
- дапамагае навучэнцам правільна арганізоўваць і аналізаваць інфармацыю. Дыяграмы, схемы, малюнкі, карты памяці і інш. спрыяюць засваенню вялікіх аб’ёмаў інфармацыі. Іх лёгка запамінаць і прасочваць ўзаемасувязі паміж блокамі інфармацыі;
- развівае крытычнае мысленне;
- дапамагае навучэнцам інтэграваць новыя веды;
- дазваляе звязваць атрыманую інфармацыю ў цэласную карціну аб з’яве або аб’екце.

Сярод прыёмаў візуалізацыі вылучаюць **прэзентацыі Power Point, відэаролікі, кліпы на вершаваныя творы, інтэлект-карты, буктрэйлеры, воблака слоў, кроссэнс.**

Слова **“кроссэнс”** азначае “перакрыжаванне сэнсаў”. Гэты прыём распрацаваны Сяргеем Федзіным – пісьменнікам, педагогам, матэматыкам і Уладзімірам Бусленкам – доктарам тэхнічных навук, мастаком і філосафам.

**Кроссэнс** уяўляе сабой асацыятыўны ланцуг, замкнёны ў поле з 9 квадратаў, у якіх змешчаны выявы. Кожны малюнак звязаны з папярэднім і наступным па сэнсе. Задача – растлумачыць кроссэнс, склаўшы аповед па ўзаемазвязаных малюнках.

**Алгарытм стварэння кроссэнса:**

1. Вызначыць тэматыку, агульную ідэю.
2. Вылучыць 9 элементаў, якія маюць дачыненне да тэмы.
3. Сканцэнтраваць сэнс у адным элеменце (цэнтр).
4. Вылучыць адметныя рысы кожнага элемента.
5. Падабраць малюнкі, якія ілюструюць элементы.

6. Замяніць прамыя вобразы сімвалічнымі.

7. Пабудаваць асацыятыўную сувязь паміж вобразамі.

Дзевяць малюнкаў расстаўлены такім чынам, што кожны мае сувязь з папярэднім і наступным, а цэнтральны аб’ядноўвае па сэнсе адразу некалькі. Сувязі могуць быць як павярхоўнымі, так і глыбіннымі.

Задача навучэнцаў – растлумачыць кроссэнс, скласці апавяданне-асацыятыўны ланцужок праз узаемасувязь малюнкаў.

Пачаць можна як з першага, так і з любога вядомага малюнка. Цэнтральным з’яўляецца квадрат з нумарам 5. Звычайна трэба ўстанавіць сувязі па перыметры паміж квадратамі 1-2, 2-3, 3-6, 6-9, 9-8, 8-7, 7-4, 4-1, а таксама па цэнтральным крыжы паміж квадратамі 2-5, 6-5, 8-5, 4-5. Калі малюнкі цяжка растлумачыць, можна даць тэкставую падказку.

Такі прыём дазваляе стварыць рознаўзроўневыя навучальныя задачы і дае магчымасць прасоўвацца ад аднаго ўзроўню да наступнага. Напрыклад, на першай прыступцы навучэнцы вызначаюць зададзеную тэму, на другой – вырашаюць кроссэнс, знаходзячы асацыяцыі паміж суседнімі малюнкамі, на трэцяй ступені – знаходзяць не толькі суседнія асацыяцыі, але і крыжаваныя, на чацвёртай – вызначаюць асацыяцыю, якая аб’ядноўвае ўсе вобразы, на пятай – ствараюць свой кроссэнс. Можна прыбраць элементы з кроссэнса і прапанаваць навучэнцам самім вырашыць, што павінна быць у 5 квадраце.

Кроссэнс, створаны вучнем, адлюстроўвае глыбіню разумення вучнем зададзенай тэмы, спрыяе развіццю лагічнага і вобразнага мыслення, павышае матывацыю і развівае творчыя здольнасці.

Імкнучыся адлюстраваць сваё бачанне, вучні шукаюць цікавы дадатковы матэрыял, праяўляюць нестандартнае мысленне і павышаюць узровень уласнай эрудыцыі. Як любое творчае заданне, кроссэнсы павышаюць ініцыятыўнасць, крэатыўнасць і развіваюць уяўленне.

Кроссэнс можна выкарыстоўваць на не толькі ў выхаваўчай рабоце па прадмеце, але і на ўроках.